Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 4 (28620)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СВЯТА ДУШЭЎНАЙ ГАРМОНІІ

**Праваслаўным хрысціянам Беларусі**

**Дарагія суайчыннікі! Віншую вас з Раством Хрыстовым.**

Гэта чароўнае свята, азоранае дабрынёй і пяшчотай, пабуджае ўсвядоміць каштоўнасць міру і згоды на роднай зямлі, заклікае прытрымлівацца хрысціянскіх ідэалаў любові і міласэрнасці.

Раство — час сяброўскіх сустрэч, незабыўнага адчування цяпла, дамашняй утульнасці і ўзаемаразумення.

Сардэчна жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і душэўнай гармоніі.

Няхай святочны настрой калядных дзён напоўніць ваша жыццё святлом і радасцю, падорыць спакой і дабрабыт вашым сем'ям.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## *ЛІЧБА ДНЯ*

**4 млн кв. м**

*жылля мяркуецца пабудаваць у 2018 годзе, у тым ліку 900 тыс. кв. м — з дзяржпадтрымкай. Пры гэтым для забеспячэння жыллём 7 тысяч 29 шматдзетных сем'яў плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 562,6 тыс. кв. м. Летась для 4 тысяч 359 шматдзетных сем'яў быў прадугледжаны ўвод 281,2 тыс. кв. м. Гэты кірунак застаецца прыярытэтным у жыллёвым будаўніцтве. Пры будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай у 2018 годзе плануецца асвоіць 562 млн рублёў па Указе № 240 аб адрасным субсідзіраванні ў жыллёвым будаўніцтве, 119,83 млн рублёў складуць ільготныя крэдытныя рэсурсы.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.01.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9869 | ▲ |
| Еўра | 2,3963 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0348 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0705 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# СВЯТЛО ЗАЎЖДЫ ПЕРАМАГАЕ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Раждзественскае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і ўсім верным дзецям Беларускай Праваслаўнай Царквы**



***Хваліце Госпада, усе народы, услаўляйце Яго, усе плямёны: Бо вялікая міласць Яго да нас, і ісціна Гасподняя вечная. (Пс. 116, 1—2)***

Узлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры, пачэснае прасвітарства, у Хрысце дыяканства, богалюбівыя манахі і манахіні, дарагія браты і сёстры!

Сардэчна, са светлай радасцю вітаю вас і віншую з найвялікшай спасіцельнай падзеяй: прышэсцем у свет Сонца Праўды — Хрыста, Бога нашага: *«Слова стала плоццю, і жыло сярод нас, і мы бачылі славу Яго ад Айца, славу як Адзінароднага, поўнага благадаці і ісціны»* (Ін. 1:14). Любячы Сваё стварэнне, Стваральнік і Спасіцель наш Хрыстос-Бог стаў чалавекам, ва ўсім падобным да нас, акрамя граху (1 Цім. 3:16; Яўр. 4:15). Гасподзь прынёс заблуднаму чалавецтву найвялікшы з усіх дароў — Сваю Бажэственную любоў. Прыйшоў на зямлю Сын Божы, каб выратаваць свет, вызваліць чалавека ад страху смяротнага і ад самой смерці, дараваць паўнату быцця ў Богу і жыццё вечнае кожнаму, хто пачуе заклік Яго і рушыць услед за Ім.

У сваім пасланні апостал Павел звяртаецца да карынфскіх хрысціян, а праз іх і да кожнага з нас, з адным з такіх заклікаў: *«Праслаўляйце Бога і ў целах вашых, і ў душах вашых, якія належаць Богу»* (1 Кар. 6:20). Галоўны сэнс гэтага закліку заключаецца ў тым, каб мы не толькі дзякавалі Богу і ўзносілі Яму хвалу ў малітвах і песнапеннях, але і прыносілі добры плён — справы любові і міласэрнасці на славу Божую, на славу Царквы, на карысць Айчыны і на карысць бліжняга, несучы *«цяжары адзін аднаго»* (Гал. 6:2) — і ў радасці, і ў бядзе.

Гасподзь запаведаў нам любіць адзін аднаго, захоўваць царкоўнае адзінства, несці людзям мір Хрыстоў і дабро, быць незласлівымі і цярплівымі, быць руплівымі ў малітве і ў служэнні слабым і абяздоленым. *«Па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі любоў будзеце мець паміж сабою»* (Ін. 13:35), — кажа нам Спасіцель і Гасподзь — Ісус Хрыстос. Прылучаючыся да гэтай найдасканалейшай Божай любові, мы атрымліваем непераможную зброю *«супраць злых духаў паднябесных»* (Эф. 6:12), атрымліваем здольнасць паспяхова супрацьстаяць усім выклікам часу. Якія б спакусы і выпрабаванні ні спасцігалі нас у зямным жыцці, словы Госпада: *«Я з вамі ва ўсе дні да скančэння веку»* (Мф. 28:20) усяляюць у нас надзею, што Ён не пакідае нас сёння і не пакіне ў будучы час.

СТАР. 4

■ Святочнае

## У ГОСЦІ ДА АРХІМАНДРЫТА САВЫ

**Пра насельніка Свята-Мікольскага манастыра архімандрыта Саву (Мажуку), які вядзе праграму «Свет невячэрні» на тэлеканале «Саюз», піша кнігі і выкладае ва ўніверсітэце, ведала і раней, а вось асабіста пазнаёміцца давялося толькі падчас сумеснай з калегамі «звяздоўскай» вандроўкі па Гомельскай вобласці. Крыху стаміўшыся ад наведвання мясцовых прыгажосцяў, прыйшлі падзарадзіцца ў манастыр. І сапраўды, стому як рукой зняло. За варотамі зусім іншая рэальнасць.**

### 9 манахаў і 12... катоў

Уладанні невялікія, але ўсё, што трэба для манастырскага жыцця і богаслужэнняў, тут ёсць — два храмы, тры званіцы (у тым ліку дзіцячая), брацкі корпус, трапезная, бібліятэка, кніжная крама. А яшчэ маецца свая тэлестудыя, дзе робяцца запісы для праваслаўнага канала і відэаролікі для Ютуба. Няма толькі гасцініцы, дзе маглі б часова прыпыніцца вандроўныя паломнікі. «Самім месца ледзь хапае», — усміхаецца бацюшка.

Нам пашчасціла апынуцца ў Гомелі напярэдадні навагодніх свят, адпаведны настрой адчуваўся і тут. Аб набліжэнні Каляд нагадваў матэрыялізаваны з адмысловага матэрыялу старазапаветны сюжэт з нараджэннем Хрыста — зробленыя з дрэва «яслі», вывы Багародзіцы, Іосіфа, пастухоў, якія прыйшлі пакланіцца Богачалавеку... Крыху далей вялікая ўпрыгожаная самаробнымі цацкамі ёлка. А бачылі б вы, з якім абыякавым выглядам па манастырскім двары гуляюць каты! Тут для іх наогул рай. Нават не звяртаюць увагі на наведвальнікаў. Мяўкаючыя чатырохногія з'яўляюцца ў манастыры пастаянна, і спробы тутэйшых насельнікаў знайсці ім гаспадароў не заўсёды заканчваюцца поспехам.

— Вось так і жывём — 9 манахаў і 12 катоў, — смяецца айцец Сава.

### Вяртанне страчанага

Манастыру ўсяго крыху за 20 гадоў, а вось Мікольскі храм з'явіўся нашмат раней — у 1904 годзе. На яго лёс выпала шмат выпрабаванняў. На ўваходзе на вочы трапляе памятная шыльда з імёнамі свяшчэннікаў, расстраляных у ноч на 1 лістапада 1937 года.

СТАР. 4

# ПАДАРУНКАЎ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

У гэтыя навагоднія перадкалядныя дні дзеці ўсёй краіны працягваюць атрымліваць святочныя віншаванні. Падарункі ад Прэзідэнта былі ўручаны выхаванцам чатырох спецыялізаваных устаноў адукацыі Магілёўшчыны — школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі слыху ў Бабруйску, Каменскай дапаможнай школы-інтэрната, школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату ў Асіповічах і спецшколы-інтэрната з парушэннямі зроку ў Шклове. Не засталіся без прэзідэнцкіх падарункаў выхаванцы Магілёўскага Дома дзіцяці і маленькія пацыенты абласной дзіцячай бальніцы. Разам з цукеркамі ім прэзентавалі развіваючыя гульні.

— Вельмі важна, што ніводнае дзіця краіны не застаецца без увагі. Акцыяй «Нашы дзеці» на Магілёўшчыне сёлета было ахоплена больш за 150 тысяч дзяцей. Гэта вельмі важны дабрачынны праект, які даказаў сваю значнасць на працягу многіх гадоў, — падкрэсліў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ.** — Ён ужо стаў навагоднім брэндам Беларусі. Каля 600 дзяцей прыняло ўдзел у губернатарскай дабрачыннай ёлцы, якая адбылася напярэдадні Новага года ў абласным Цэнтры творчасці. Яшчэ 40 юных жыхароў вобласці пабывалі на Прэзідэнцкай ёлцы ў Палацы Незалежнасці. Цяпер дзеці, якія маюць патрэбу ў асаблівай увазе, атрымліваюць падарункі ад Прэзідэнта. Усё гэта ўсяляе радасць у дзіцячыя сэрцы, а значыць робіць наш свет лепшым.

Разам з падарункамі і віншаваннямі дзеці атрымалі магчымасць яшчэ раз акунуцца ў казачную атмасферу навагодніх прадстаўленняў і паназіраць за захапляльнымі прыгодамі Дзеда Мароза са Снягуркай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# 25 ШАЙБАЎ У АДНЫ ВАРОТЫ

**Гэты Калядны турнір запомніцца гледачам сваёй відовішчнасцю**

**Учора хакейныя баталіі на Калядным турніры працягваліся. Каманда Швейцарыі, якая за дзень да гэтага перамагла кітайцаў з лікам 7:4, сустракалася са зборнай ААЭ, якая напярэдадні пацярпела паражэнне ад зборнай Прэзідэнта Беларусі (7:12). Учора лёд «Чыжоўка-Арэны» не аддаў перавагу нікому — каманды згулялі ўнічыю (4:4).**



Фота БЕЛТА.

Але героем першых матчаў учарашняга дня была, несумненна, зборная Чэхіі. На лёдзе «Чыжоўка-Арэны» яны разграмілі сапернікаў са зборнай Балкан — 25:3. Зыход сустрэчы ў групе В вырашаны быў ужо пасля першага перыяду, у якім пераможцы закінулі дзевяць шайбаў. Для каманды Чэхіі гэта ўжо другая буйная перамога на турніры. Напярэдадні былі зрынутыя шведы — 19:3. Учора ў гэтым квартэце позна ўвечары адбыўся яшчэ адзін матч: Расія сустракалася на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» са шведамі. У групе А ў вячэрняй праграме спаборніцтваў на вялікай пляцоўцы спарткомплексу згулялі хакейная каманда Прэзідэнта Беларусі і зборная Кітая.

Сёння зборная Швецыі сустрэнецца з камандай Балкан, КНР згуляе з ААЭ, Беларусь — са Швейцарыяй, а Расія — з Чэхіяй. А заўтра адбудзецца матч за трэцяе месца і, канешне, фінал, які вызначыць наймацнейшага, і, трэба спадзявацца, будзе не менш відовішчным і таксама багатым на забітыя шайбы.

**❍ Меркаванне з лёду**

# ПОЎНАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ

**Генадзь САВІЛАЎ, нападаючы хакейнай каманды Прэзідэнта Беларусі, заявіў у размове з журналістамі, што, безумоўна, галоўная задача — перамога ў турніры.**

— Мы трэніруемся пастаянна на працягу года — па два-тры разы на тыдзень, удзельнічаем у спаборніцтвах, — расказаў форвард. — Многія з нас гуляюць у аматарскай хакейнай лізе, там таксама ёсць трэніроўкі, гульні, зусім нядаўна быў турнір у Арабскіх Эміратах. Так што лёдавай падрыхтоўкі для аматарскага ўзроўню больш чым дастаткова.

Трэба сказаць, што падчас гульні ў чацвер з камандай Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў ужо ў першым перыядзе наша каманда лідзіравала з лікам шэсць — ноль. Пазней госці імкнуліся адыграцца, але ў выніку перамога так і засталася за намі: 12:7.

— Для самога нечаканасць, што такая значная перавага ў гульні, — прызнаўся Генадзь Савілаў пасля першага тура. — Відаць, мы вельмі моцна рыхтаваліся, імкнуліся падысці да гэтых спаборніцтваў у поўнай мабілізацыі. Сваю ролю сыграла і тое, што каманда з Арабскіх Эміратаў, ды і няма ў іх такой падтрымкі балельшчыкаў, якая ёсць у нас.

Умовы гульні нападаючы ацаніў на «выдатна»:

— Зручнае размяшчэнне «Чыжоўка-Арэны», зручна сумясціць балельшчыцкую цікавасць да спаборніцтва міжнароднага значэння сярод дарослых і рэспубліканскага значэння — сярод моладзі. Спадзяюся, што ў будучым такая традыцыя працягнецца.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ **Меркаванне**



# ДА ЧАГО МОЖА ПРЫВЕСЦІ СПРЭЧКА ЗША З ПАКІСТАНАМ?

**Знешняя палітыка ЗША ў 2018 годзе ў асобе прэзідэнта Дональда Трампа, які адказвае за яе рэалізацыю, пачалася з яго рэзкага выказвання ў «Твітары» ў адрас Пакістана: «Злучаныя Штаты па дурасці далі Пакістану больш за 33 мільярды долараў дапамогі за апошнія 15 гадоў, а яны нам нічога не далі, акрамя хлусні і падману, мяркуючы, што нашы лідары — дурні. Яны даюць сховішча тэрарыстам, якіх мы шукаем у Афганістане. Дапамогі ніякай. Хопіць!» З чым звязана гэтая заява і наколькі яна праўдзівая, што можа адбыцца, калі наступіць глыбокі крызіс у амерыкана-пакістанскіх адносінах?**

Заява Трампа звязана, безумоўна, з яго сумнеўнай кампетэнтнасцю ў сферы знешняй палітыкі. Мала ў чым разбіраючыся, ён у той жа час спрабуе простымі метадамі вырашаць складаныя пытанні. Між тым у такой далікатнай сферы, як знешняя палітыка і дыпламатыя, гэта звычайна дае адваротны вынік. Дастаткова паглядзець, як прайшло галасаванне ў Генеральнай асамблеі ААН па пытанні прызнання Іерусаліма сталіцай Ізраіля, што раней зрабілі ЗША і да чаго заклікалі ўсіх сваіх саюзнікаў. Напярэдадні галасавання Дональд Трамп не прыдумаў нічога лепшага, як паабяцаць пазбавіць фінансавай дапамогі тых амерыканскіх саюзнікаў, якія прагаласуюць супраць ЗША па гэтым пытанні. Між тым гэта толькі пагоршыла вынікі галасавання. Па выніках галасавання ў Генеральнай асамблеі ААН 128 краін заклікалі ЗША адмяніць рашэнне аб прызнанні Іерусаліма сталіцай яўрэйскай дзяржавы, 35 краін устрымаліся і толькі дзевяць падтрымалі амерыканцаў. Нашмат лепшы вынік магла б даць тайная праца сам-насам з кожнай краінай-саюзніцай. А так выйшла вельмі проста — прагаласаваў супраць рэзалюцыі — значыць, амерыканцы цябе купілі. Вельмі сумнеўны імідж для многіх рэгіёнаў свету і вялізныя праблемы для многіх лідараў краін, якія нават з'яўляюцца амерыканскімі васаламі, але імітуюць для грамадскасці поўны суверэнітэт і незалежнасць сваёй краіны.

Калі разгледзець сітуацыю з амерыканскай дапамогай дэталёва, то галоўнае пытанне заключаецца ў тым, чаму папярэднікі Трампа на пасадзе прэзідэнта ЗША выплацілі такую вялікую суму Пакістану, калі, на думку Трампа, Ісламабад не аказваў і не аказвае ніякай дапамогі ЗША? Трамп цалкам памыляецца: амерыканцы ніколі не плацяць грошы проста так, і яго папярэднікі цудоўна разумелі, што яны аплачваюць.

Па-першае, Пакістан — адзіная ў свеце ісламская дзяржава з ядзернай зброяй, і Вашынгтон з гатоўнасцю плаціў мільярды долараў, каб не рэалізаваўся адзін з самых страшных кашмараў для Захаду. Уявім сабе, што дзясяткі мільярдаў долараў не былі б выплачаны Ісламабаду ў папярэднія гады, што зрабіла яго прыхільным да супрацоўніцтва з ЗША, і гэтая краіна стала б варожай да Захаду? Цалкам магчымай была б сітуацыя, пры якой ісламскія тэрарысты па ўсім свеце атрымалі б доступ да дастаткова сучасных тэхналогій па вытворчасці ядзернай зброі. І лёгка здагадацца супраць каго ў першую чаргу гэта зброя можа быць выкарыстана. Адмова Трампа аказваць фінансавае садзейнічанне можа зрабіць такі сцэнарый магчымым у будучыні.

Па-другое, усе гэтыя гады ЗША праводзяць маштабную аперацыю ў Афганістане. Папярэднюю аперацыю па прымірэнні Афганістана праводзіў савецкі ўрад, і адным з галоўных фактараў, чаму аперацыя не ўвянчалася поўным поспехам, было адвочанае процідзеянне Маскве з боку Ісламабада. З тэрыторыі суседняга Пакістана ў Афганістан ішоў бясконцы паток баевікоў і сучаснай зброі, падсілкоўваючы вайну супраць савецкіх салдат і ўрада сацыялістычнага Афганістана. Амерыканскае ўварванне ў Афганістан таксама было дрэнна ўспрынята насельніцтвам Пакістана, як і савецкая аперацыя, але дзясяткі мільярдаў долараў, выплачаных Вашынгтонам, дазволілі элітам Ісламабада закрыць на гэта вочы. У амерыканцаў і так не вельмі атрымліваецца барацьба з талібамі ў Афганістане, і адмова Трампа плаціць Пакістану звыклы хабар калі не за супрацоўніцтва, дык за несупрацьдзеянне амерыканцам, можа сітуацыю толькі ўскладніць.

Па-трэцяе, Пакістан не тая краіна, якая нікому не патрэбна. Наадварот, у яе пятае ў свеце па памеры насельніцтва і ўнікальнае стратэгічнае становішча ў сваім рэгіёне. У сувязі з гэтым Кітай ужо некалькі дзесяцігоддзяў таксама ўсяляк супрацоўнічае з Ісламабадам і грошай для свайго саюзніка не шкадуе. Адмова ЗША быць такім жа шчодрым саюзнікам можа даць Кітаю больш трывалы саюз з Пакістанам, і ў гэтым для ЗША не будзе нічога добрага. Улічваючы і той факт, што вельмі важная для планаў ЗША Індыя мае дастаткова напружаныя адносіны і з Кітаем, і з Пакістанам.

Па-чацвёртае, планы Трампа па пераглядзе ядзернай здзелкі з Іранам таксама шмат у чым залежаць ад суседа Ірана — Пакістана. На Іран будзе значна цяжэй ціснуць, калі Пакістан не будзе больш аказваць садзейнічанне ЗША ў рэгіёне.

Пятая прычына, па якой з Пакістанам многія хочуць супрацоўнічаць, заключаецца ў яго ролі ў транзіце нафты з Персідскага заліва, дзе сканцэнтравана трэць усіх нафтавых запасаў планеты. Мір і спакой на пакістанскім беразе — адна з галоўных умоў для атрымання неабходных аб'ёмаў нафты многімі з важных саюзнікаў ЗША, у тым ліку Еўрасаюзам.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР пагадзілася на прамыя перамовы з Паўднёвай Карэяй



На першай за два гады сустрэчы на высокім узроўні бакі павінны абмеркаваць Алімпіяду ў Пхёнчхане.

Як паведамляе агенцтва Bloomberg са спасылкай на супрацоўніка міністэрства аб'яднання Паўднёвай Карэі Хён Тэ Байка, на перамовах плануецца абмеркаваць як удзел КНДР у зімовай Алімпіядзе ў Пхёнчхане, так і сітуацыю на паўвостраве ў цэлым.

Гэта будзе першая сустрэча на высокім узроўні з 2015 года.

Ідэю перамоў у чацвер падтрымаў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Пентагон ужо абвясціў, што запланаваныя на пачатак года сумесныя вайсковыя вучэнні з Паўднёвай Карэяй перанесены і пройдуць толькі пасля завяршэння Параалімпіяды.

Правядзенне перамоў абмяркоўвалася 3 студзеня пры дапамозе тэлефоннай гарачай лініі, якая запрацавала праз працяглы час.

У сваім навагоднім віншаванні 1 студзеня лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын заявіў аб жаданні КНДР удзельнічаць у Алімпійскіх гульнях у Пхёнчхане і гатоўнасці пачаць перамовы з Сеулам. «Зімовыя Гульні, якія пройдуць у Паўднёвай Карэі, стануць добрай падзеяй для краіны», — сказаў ён. Пры гэтым паўночнакарэйскі лідар зноў адзначыў, што Пхеньян не мае намеру адмаўляцца ад нацыянальных ядзерных сіл.

### У Белым доме забароняць карыстацца асабістымі мабільнымі тэлефонамі

Кіраўніцтва адміністрацыі ЗША забароніць усім сваім супрацоўнікам выкарыстоўваць асабістыя мабільныя тэлефоны падчас работы ў Заходнім крыле Белага дома, дзе знаходзіцца адміністрацыя прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і Авальны кабінет кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт Дональд Трамп вельмі занепакоены ўцечкай у прэсу спраў яго адміністрацыі, адзначае Bloomberg. Але яго памочнікі сцвярджаюць, што падобнага роду забароны не звязаны з боязззю новых уцечак.

Памочнікі Трампа, якія выступалі супраць такой забароны, заявілі, што не змогуць выкарыстоўваць працоўныя тэлефоны для асабістых патрэб, таму што на іх нельга дрўкаваць паведамленні. Паводле іх слоў, гэта самы просты спосаб звязацца са сваімі сем'ямі ў разгар працоўнага дня або падчас сустрэч.

Паводле слоў спецыяліста па інфармацыйнай бяспецы Group-IB Андрэя Лявонава, такая забарона не зможа прынесці патрэбнага выніку ў плане абмежавання ўцечак, ёсць мноства іншых спосабаў «панесці» інфармацыю з Белага дома, акрамя карыстання асабістым смартфонам.

### У Дубаі прыбіральшчык знайшоў сумку з брыльянтамі, але аднёс яе ў паліцыю

Індус Вінакатар Аман Матабата, які працуе прыбіральшчыкам у Дубаі, знайшоў сумку з брыльянтамі і золатам, піша Gulf News.

Як паведамляе выданне, сумка была знойдзена мужчынам падчас уборкі аднаго з будынкаў у раёне Аль Кузейс (раён Дубая). Сваю знаходку ён аднёс у паліцыю, дзе яе змесціва ацанілі ў 55 тысяч долараў.

Кіраўніцтва паліцыі ўзнагародзіла індуса падзячнай граматай і спецыяльным падарункам. Праўда, якім менавіта — не паведамляецца.

■ Знешняя палітыка

# КАНТАКТЫ, ПЕРАМОВЫ, ПРЫЯРЫТЭТЫ...

**Міністэрства замежных спраў апублікавала штогадовы агляд вынікаў знешняй палітыкі нашай краіны. Мы годна рэалізавалі адказную міжнародную місію — у 2017-м Беларусь упершыню старшынствавала ў Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятыве і прыняла сесію Парламенцкай асамблеі АБСЕ.**

«Статус Мінска як аднаго з важных ядналючых месцаў Еўропы пацвердзіла штогадовая сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (5—9 ліпеня), у ходзе якой Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прапанаваў пачаць у рамках АБСЕ дыскусію аб магчымасці запуску перамоўнага працэсу, накіраванага на пераадоленне існуючых супярэчнасцяў паміж дзяржавамі на агульнай прасторы ў Еўра-Атлантыцы і Еўразіі, на фарміраванне новых канструктыўных адносін у рэгіёне АБСЕ (так званы новы Хельсінкскі працэс)», — адзначаецца ў аглядзе.

На знешнеэканамічным кірунку асноўныя намаганні былі накіраваны на пашырэнне сувязяў з традыцыйнымі партнёрамі і асваенне новых рынкаў. У 2017 годзе сетка дыпламатычных і консульскіх устаноў прадстаўляла інтарэсы нашай дзяржавы у 58 дзяржавах (з улікам акрэдытацыі паслоў па сумяшчальніцтве — у 117). Сёння ў Беларусі ажыццяўляюць сваю дзейнасць 48 пасольстваў, чатыры аддзяленні пасольстваў, тры гандлёвыя прадстаўніцтвы, 40 консульскіх устаноў замежных дзяржаў, 17 прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый. Па сумяшчальніцтве з Масквы, Вільнюса, Варшавы і Кіева акрэдытавана 91 замежнае дыппрадстаўніцтва.

Летась адносіны з нашым найбліжэйшым партнёрам — Расійскай Федэрацыяй — «захоўвалі ўсеабдымны характар». Блізкія стасункі падтрымліваліся і з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Грузіяй. Разам з тым, як адзначаецца ў аглядзе МЗС, «больш структураваным і эканамічна насычаным у 2017 годзе стаў дыялог з Еўрапейскім саюзам».

«Завяршаецца ўзгадненне Прыярытэтаў партнёрства Беларусь—ЕС, якія станучь «дарожнай картай» супрацоўніцтва на 2018—2020 гады ў чатырох абласцях: умацаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання; эканамічнае развіццё і рынкавыя магчымасці; транспартныя камунікацыі, энергетыка, экалогія і клімат; кантакты паміж людзьмі. Для рэалізацыі праектаў у згаданых сферах у наступныя тры гады ЕС толькі па лініі краінавай праграмы тэхдапамогі плануе выдзеліць Беларусі ад 112 да 136 млн еўра ў выглядзе грантаў», — паведамляецца ў аглядзе.

Далейшым паступальным развіццём характарызуюцца і адносіны са Злучанымі Штатамі.

Асаблівым мінулы год быў і ў беларуска-кітайскіх адносінах. Удзел Прэзідэнта нашай дзяржавы ў Міжнародным форуме «Адзін пояс і адзін шлях» у КНР 15 мая ўзмацніў пазіцыі Беларусі як актыўнага ўдзельніка будаўніцтва канцэпцыі «Пояса і шляха», што набыла глабальны характар. Вынікам дамоўленасцяў на вышэйшым узроўні стала прасоўванне галоўнага сумеснага праекта — індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# «Я ГАТОВА ГУЛЯЦЬ»

**Аляксандра Сасновіч упершыню ў кар'еры выйшла ў фінал турніру катэгорыі «Прэм'ер» у Брысбене**

**Такім чынам наша тэнісістка стала першай спартсменкай у гісторыі аўстралійскага турніру, якая дабралася да вырашальнага матча, папярэдне прайшоўшы праз сіта кваліфікацыі. У асноўнай сетцы Сасновіч паслядоўна адолела Крысціну Младэнавіч (у першым крузе), Анэт Кантавэйт (у 1/8 фіналу), Алізэ Карнэ (у чвэрцьфінале) і Анастасію Севаставу (у паўфінале).**



*— Упачатку турніру я не магла нават уявіць, што змагу прайсці кваліфікацыю. Так, фізічна знаходжуся не ў найлепшай форме, але маральна я гатова гуляць і хачу выйграць!* — кажа Аляксандра ў пасляматчавым інтэрв'ю. — *Я думаю, адзін гулец заўсёды можа выйграць у іншага. Гэта тэніс. Мяч круглы, а кожны дзень новы. Усё магчыма. Я асаблiва рада таму, што мой бацька тут. Ён правёў 24 гадзіны ў самалёце, не спаў двое сутак толькі для таго, каб убачыць мой матч.*

У фінале сёння Аляксандра Сасновіч сустрэнецца з украінскай тэнісісткай Элінай Світолінай.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ За духоўнае адраджэнне

# ВЫТОК БЕЛАРУСКАЙ КНІГІ — У ТВАІХ РУКАХ

## Поўнае факсіміле Скарынавых выданняў стварыць было няпроста, але яно таго вартае



**Калектыву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сёлета прысуджана ганаровая ўзнагарода — прэмія Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» за работу па факсімільным узнаўленні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Магчыма, у хуткім часе і мы з вамі зможам пагартаць асобнік копіі самай старажытнай беларускай кнігі, а пакуль што намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, старшыня Міжнароднай арганізацыі беларусістаў свету Алесь СУША распавядае, з чаго ўсё пачалося.**

— У 2012 годзе мы ўсвядомілі, што ў Беларусі захоўваецца ўсяго дзесяць няпоўных выданняў Скарыны. Набліжаўся юбілей беларускага кнігадрукавання, і такім чынам з'явілася ідэя стварыць факсіміле выданняў першадрукара.

Нягледзячы на тое, што Францыск Скарына ва ўсіх на слыху, Алесь Суша ўпэўнены, што беларусы да гэтага часу цьмяна ўяўляюць, якую спадчыну і ў якім аб'ёме пакінуў ім асветнік з Полацка. Супрацоўнікі бібліятэкі шукалі інфармацыю, дзе цяпер знаходзяцца скарынаўскія кнігі і ў якім яны стане. Для гэтага ладзіліся экспедыцыі ў Маскву, Вільню, Лондан... Раней таксама былі спробы факсімільных выданняў, аднак зборы твораў выходзілі няпоўныя. Цяпер жа быў замах стварыць поўнае выданне ўсіх кніг Скарыны, якія толькі вядомыя ў наш час.

Згодна з канцэпцыяй, сістэмная работа праходзіла па некалькіх кірунках. Найперш навукоўцы займаліся бібліятэчна-інфармацыйнымі росшукамі. Сярод усіх выданняў у розных краінах выбіралі найбольш захаваныя, поўныя экзэмпляры. Старадрукі даходзяць да нас у розным стане, і бывалі выпадкі, калі іх літаральна даводзілася складаць па частках, як, напрыклад, скарынаўскі «Псалтыр». У свеце захавалася ўсяго два экзэмпляры гэтай кнігі, прычым абодва няпоўныя. Супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі рабілі лічбавыя копіі кожнага асобніка, а потым «аб'ядноўвалі» іх у адзін том.

Другую частку работы можна ўмоўна назваць тэхнічна-лічбавай. Гэта быў этап перамоў, дамоваў, перапіскі. Некаторыя з уладальнікаў старажытных кніг згаджаліся дапамагчы на добраахвотным пачатку, другія прадстаўлялі копіі за плату, з іншымі працавалі па прынцыпе абмену. У выніку ўдалося сабраць каля 300 алічбаваных выданняў Скарыны. Дарэчы, паглядзець поўны збор копій можна цяпер у Нацыянальнай бібліятэцы, а частка архіва існуе ў свабодным доступе ў інтэрнэце. Друк захаваў усе асаблівасці паперы, пазначэнні алоўкам і пяром на палях кніг, плямы ці надарванасці. Іх не рэтушавалі, каб захаваць дакладнасць.

Трэцяя частка работы над выданнем была навуковая. Кнігі Скарыны ўпершыню даследаваны комплексна з пункту гледжання рэлігійнай практыкі, кнігазнаўства, мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства і мовазнаўства. Што асабліва важна — вынікі пададзеныя чытачам на беларускай, рускай і англійскай мовах, яснымі і зразумелымі словамі. Таксама ўпершыню загучаць на сучаснай мове прадмовы і пасляслоўі першадрукара.

Сёння факсіміле складае 20 тамоў тыражом у 1000 экзэмпляраў. Паліграфічнае выданне было толькі першай часткай працы. Другая палова работы са спадчынай Скарыны заключалася ў акцыях, мерапрыемствах, прэзентацыях, якія прайшлі бадай у кожным раёне Беларусі і ці не ў кожнай еўрапейскай краіне.

— Факсімільнае выданне адкрые магчымасць даследаваць мінуўшчыну самаму шырокаму колу чытачоў. Раней доступ да 500-гадовых асобнікаў мелі толькі навукоўцы, цяпер жа запланавана перадаць выданне ва ўсе ВНУ, буйныя і раённыя бібліятэкі краіны, музеі, установы, якія носяць у сваёй назве імя першадрукара.

Алесь Суша спадзяецца, што факсіміле стане матэрыяльным увасабленнем велічы кніжнай спадчыны беларусаў, бо цяпер справа першадрукара — гэта не проста некалькі старонак у падручніку гісторыі, а цэлая паліца з сапраўднымі кнігамі ў бібліятэцы.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

## Сучасныя пісьменнікі — дзецям

**Міністэрства інфармацыі краіны абвясціла аб старце праекта «Культурны маршрут «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі — дзецям». Галоўная мэта — прапаганда чытання, прыцягненне школьнікаў да кнігі, да шырокага знаёмства з сучаснай беларускай літаратурай.**

Суарганізатары акцыі — рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Сябры «Вясёлкі», Саюз пісьменнікаў Беларусі, часопіс «Вясёлка», Выдавецкі дом «Звязда», «Белкніга», выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Адукацыя і выхаванне», «Пачатковая школа», абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты. У праграме сапраўды творчага праекта — сустрэчы пісьменнікаў са школьнікамі, розныя інтэрактыўныя прэзентацыі кніг, конкурсы чытальнікаў, правядзенне гульняў і самых розных імпрэз, прысвечаных кніжным героям. «Культурны маршрут...» пройдзе па ўсёй краіне, па ўсёй Беларусі. Да ўдзелу ў праекце арганізатар і суарганізатары запрашаюць усіх зацікаўленых, усіх, для каго каштоўнасці чытання, кнігі іграюць важную ролю і ў выхаванні, і ў адукацыі як асобы, так і ўсяго грамадства.

**Сяргей ШЫЧКО.**
*shychko@zviazda.by*

■ Кадравае пытанне

# КАГО РЫХТАВАЦЬ: МЕДЫКАЎ ЦІ ІНЖЫНЕРАЎ?

**З 11-х класаў летась было выпушчана 57,8 тысячы навучэнцаў. Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, больш за палову выпускнікоў школ працягваюць навучанне ў ВНУ. 20 працэнтаў паступілі на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 14,6 працэнта — на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Пасля заканчэння базавай школы працягнуць навучанне ў 10—11-м класах пажадала больш за 60 працэнтаў навучэнцаў, ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі пайшло каля 18 працэнтаў выпускнікоў і 16 працэнтаў дзевяцікласнікаў паступілі ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Наколькі такое размеркаванне патокаў моладзі адпавядае рэальным патрэбам рынку працы? І ці не атрымаецца так, што праз чатыры—пяць гадоў выпускнікі многіх спецыяльнасцяў вышэйшых навучальных устаноў акажуцца незапатрабаванымі?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пытанні збалансавання попыту і прапановы рабочай сілы знайшлі адлюстраванне ў пастанове Савета Міністраў ад 28 снежня 2017 года № 1016. Паводле гэтага дакумента, праграмы развіцця адукацыі павінны грунтавацца на прагнозе патрэбы эканомікі ў кадрах на пяцігадовы перыяд. Міністэрству эканомікі ўрадам даручана штогод да 1 верасня распрацоўваць дэмаграфічны прагноз на пяцігадовы перыяд па краіне ўвогуле, па абласцях і асобна па сталіцы, а Міністэрству працы і сацыяльнай абароны таксама штогод да 1 лістапада рабіць прагноз балансу працоўных рэсурсаў.

На аснове атрыманых звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны павінна фарміраваць патрэбы эканомікі ў кадрах на пяцігадовы перыяд па прафесійна-кваліфікацыйных групах і падаваць прагноз Міністэрству адукацыі, а таксама іншым заснавальнікам устаноў вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Гэта інфармацыя патрабуецца для фарміравання прагнозных паказчыкаў на пяцігадовы перыяд па профілях (кірунках) адукацыі, якія ўключаюцца ў дзяржаўныя праграмы развіцця вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і кантрольных лічбаў прыёму ва ўстановы вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**Цяпер у беларускіх ВНУ — занадта шырокі спектр спецыяльнасцяў і спецыялізацый: на першай ступені — каля 400 і больш як тысяча спецыялізацый. Больш як 300 спецыяльнасцяў прапануюць у магістратуры.** Сур'ёзнай праблемай застаецца і нявызначанасць статусу магістра на рынку працы. Пасля прыняцця Кодэкса аб адукацыі бакалаўрыят фактычна зойме месца цяперашняй І ступені вышэйшай школы, добра зразумелай наймальнікам. Таму пазнавальнасць дыпломаў бакалаўраў у будучыні забяспечана, чаго не скажаш пра дыпломы магістраў...

Усе разумеюць, што прафесійна-кваліфікацыйная структура вышэйшай адукацыі павінна быць аптымізаваная. Таму зараз актыўна вядзецца работа над новым Класіфікатарам спецыяльнасцяў і кваліфікацый і адначасова — над стварэннем Нацыянальнай сістэмы кваліфікацый.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# СВЯТЛО ЗАЎЖДЫ ПЕРАМАГАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Закон любові, завешчаны нам Спасіцелем, ляжыць у аснове сапраўднага *«адзінства духу»* (Эф. 4:3). Гэты закон — аснова грамадскага жыцця і салідарнасці, сумеснай стваральнай працы і супрацоўніцтва на славу Божую і на радасць тым, хто перажывае розныя нягоды і няшчасці, хто церпіць нястачу і мае патрэбу ў нашай дапамозе і падтрымцы. Але сапраўднае яднанне народа не можа абмяжоўвацца толькі часам выпрабаванняў, яно павінна стаць неад'емнай часткай нашай хрысціянскай самасвядомасці і сапраўднага хрысціянскага жыцця.

Зноў наступіла прамяністае свята Раждаства Хрыстовага, свята гарачай веры і непасаромленай надзеі на Промысл Божы, які вядзе да дабра кожнага чалавека. Зноў раскрываецца неба над зямлёю, зноў раздаецца ангельскае славаслоўе, якое абвясціла свету *«радасць вялікую, якая будзе ўсяму народу: нарадзіўся ... сёння ў горадзе Давідавым Спасіцель»* (Лк. 2:10-11). Разам з ангеламі мы зноў заклікаем заспяваць славаслоўе народжанаму Немаўляці Хрысту і, пакланіўшыся Яму, як гэта зрабілі ўсходнія мудрацы, прынесці ў дар «фіміям» сардэчнай малітвы, «золата» добрых спраў на славу Царквы і на карысць бліжняга, «міра» ахвярнага служэння бліжнім, і, прытуліўшыся да ясляў Хрыстовых, як віфлеемскія пастухі, славіць і хваліць *«Бога за ўсё тое, што чулі і бачылі»*.

Праасвяшчэнныя архіпастыры, дарагія айцы, браты і сёстры, мінулы год для многіх з нас быў няпрослы, але, міласцю Божай, ён прынёс і нямала духоўнай радасці. Гэты год быў адзначаны многімі важнымі падзеямі ў жыцці нашай Царквы. Ва ўсіх епархіях архірэі, клірыкі, набожныя вернікі людзі займаліся вырашэннем надзённых пытанняў царкоўнага жыцця: упарадкаваннем епархіяльнай і прыходскай дзейнасці, стварэннем якасна новых прыходаў, якія закліканы стаць сапраўднымі праваслаўнымі абшчынамі, здольнымі да актыўнага ўдзелу ў царкоўнай місіі, з уключэннем у іх самай актыўнай сілы грамадства — моладзі; шмат увагі ўдзялялася развіццю сацыяльных і асветніцкіх праектаў Праваслаўнай Царквы.

Найважнейшымі тэмамі многіх нашых мерапрыемстваў і разважанняў у бягучым годзе з'яўляліся: 100-я гадавіна аднаўлення Патрыяршаства ў Рускай Праваслаўнай Царкве і абранне на Патрыяршы прастол свяціцеля Ціхана; успамін аб трагічных падзеях нашай гісторыі ў XX стагоддзі і аб пачатку страшных ганенняў на Царкву Хрыстову. У тыя цяжкія гады бязбожнага ліхалецця была праліта кроў многіх навамучанікаў і вызнаўцаў, якія ў далейшым былі праслаўлены ў ліку святых. Царкоўнае праслаўленне навамучанікаў і малітоўны зварот да іх маюць асаблівае значэнне не толькі для захавання памяці пра трагічныя падзеі тых дзён, але яны яскрава сведчаць аб тым, што ў Бога ўсе жывыя, смерць пераможана смерцю і ўваскрасеннем Хрыстовым.

Малітва навамучанікам і вызнаўцам саграе нашы сэрцы, умацоўвае веру ў Бога і, нагадваючы пра мінулае, заклікае нас захоўваць веру праваслаўную, каб нічога падобнага на нашай зямлі ў будучым не адбывалася.

У мінулым годзе па шматлікіх просьбах і хадайніцтве набожных вернікаў Беларускай Праваслаўнай Царквы і асабліва Мінскай мітраполіі пачата падрыхтоўчая праца па аднойдзенню святых мошчаў блажэннай Валянціны Мінскай. Заклікаю ўсіх вас, дарагія архіпастыры, пастыры, пачэсныя інакі і інакіні, набожныя браты і сёстры, узмацніць свае малітвы да Госпада і да Прасвятой Багародзіцы, каб Яны благаславілі Айчыне, Царкве і ўсяму нашаму набожнаму народу адкрыць духоўны скарб — святыя мошчы блажэннай Валянціны Мінскай.

Мы верым, што аднойдзенне мошчаў святых угоднікаў Божых з'яўляецца найвялікшым Божым Дарам і праявай асаблівай Божай ласкі да верных людзей Сваіх. Як толькі мы станем вартымі міласці Божай і гэтага благадатнага Дару, Гасподзь пачуе нашы малітвы і выканае наша прашэнне. Аднойдзенне святых мошчаў блажэннай Валянціны і прынясенне гэтай вялікай святыні ў кафедральны сабор сталіцы Белай Русі горада Мінска стане наймацнейшым жыццесцвярджальным імпульсам, які засведчыць перад кожным з нас, жыхароў беларускай зямлі, пра вечнае значэнне жыцця чалавека ў веры і вернасці Богу, у імкненні да выканання асноўных прынцыпаў Богам запаведанага Евангельскага закону. Перакананы, што такое сведчанне паслужыць усенароднаму ўмацаванню ў свядомасці і жыцці людзей духоўна-маральных каштоўнасцяў і паспрыяе росквіту нашай Айчыны.

Святая Праваслаўная Царква заклікае кожнага з нас без ляноты працягваць працаваць над ачышчэннем і праабражэннем сваёй душы, паколькі духоўнае змяненне самога сябе — залог і аснова для праабражэння ўсяго народа нашай Айчыны.

Дарагія і ўзлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры і пастыры, інакі і інакіні, браты і сёстры! Ад усяго сэрца з любоўю ў Хрысце зноў і зноў віншую ўсіх вас з вялікім святам Раждаства Хрыстовага і з Новым годам дабрыні Гасподняй. Малітоўна жадаю вам добрага здароўя, міру, дабрабыту і невычарпальнай благадатнай дапамогі Божай у вашым жыцці, подзвігах і працы на славу Святой Царквы Хрыстовай, на карысць Айчыны і на дабро ўсім нашым бліжнім і дальнім. Амінь.

**‡ Павел,**
**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,**
**Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**
*Раждаства Хрыстова*
*2017—2018 гг., горад Мінск.*

# У ГОСЦІ ДА АРХІМАНДРЫТА САВЫ



Айцец Сава дае майстар-клас па звоне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нядаўна мы знайшлі імя першага настаяцеля нашага храма айца Данііла Акіншэвіча, — кажа бацюшка. — Яго таксама расстралялі ў 1937 годзе. У архіве КДБ знаходзіцца яго расстрэльная справа, мне давадзілася з ёй працаваць. А пазалетась нам патэлефанаваў адзін грамадзянін і сказаў, што калі разбіраў архівы дзядулі, наткнуўся на папку з паперамі — дзённік айца Пятра Рыло. Уяўляеце: запісы знайшліся 1 лістапада, у дзень яго расстрэлу. Частка дзённіка ўжо апублікавана. Інфармацыя ўнікальная, прысвечаная Першай сусветнай вайне. Пётр Рыло быў палкавым святаром, і ў яго ёсць апісанні першых дзён вайны, развіцця падзей у Гомелі. Ён тут служыў у 20-х гадах. Вельмі цікавы чалавек.

Храм пацярпеў ад савецкай улады не менш, чым іншыя. З 1929 года па 1941-ы ў ім знаходзілася школа. На першым паверсе размяшчалася спартзала, наверсе класы. Частку званіцы знеслі.

— Беларусь была аб'яўлена самай атэістычнай рэспублікай Савецкага Саюза, — кажа манах. — Да 1939 года на яе ўсходняй тэрыторыі закрылі ўсе без выключэння культавыя будынкі. Не засталося ніводнага свяшчэнніка або епіскапа. Мікольскі храм быў вельмі знявечаны, яго нават планавалі знесці. Але пачалася вайна, і яго вярнулі вернікам.

## Як Святы Мікалай сям'ю выратаваў

Адна з галоўных манастырскіх святыняў — абраз Свяціцеля Мікалая, падораны архіепіскапам Гомельскім і Мозырскім Арыстархам (Станкевічам) у 90-я гады, і часціца мошчаў святога. Свяціцеля Мікалая ведаюць як заступніка падарожнікаў, а за звычай дапамагаць людзям параўноўваюць з Дзедам Марозам. Айцец Сава расказаў яшчэ адну цудоўную гісторыю пра гэтага святога.

— З 1949 па 1958 год настаяцелем Мікольскага храма быў Ігар Базілевіч. Вельмі адукаваны чалавек, выпускнік Варшаўскага ўніверсітэта, магістр тэалогіі, сур'ёзна захапляўся фота. Мая настаўніца расказвала, што з сяброўкамі ў юнацтве бегала ў храм паглядзець на прыгожага бацюшку. Ён сапраўды быў вельмі эфектны, чарнявы, статны. І — вельмі моцны прапаведнік. Змог стварыць тут цікавую абшчыну. Гэта быў не проста прыход, а менавіта сям'я. Ён шмат працаваў, каб аднавіць храм. Пры ім ён двойчы быў расшісаны, тут тройчы мяняўся іканастас. Спачатку быў сабраны з таго, што вярнулі вернікі, потым часова карысталіся іканастасам закрытай тады Георгіеўскай царквы. Цяперашні быў зроблены ўжо спецыяльна для гэтага храма. Як мне потым расказала яго дачка, галоўнай цяжкасцю было знайсці майстра роспісу па пазалоце. Аднойчы прыйшоў чалавек, які сказаў: «Я зраблю ўсё, што трэба, прычым бясплатна». Хутка высветлілася, адкуль узялася такая шчодрасць. Пасля вайны ў Гомелі было вельмі галодна, а сям'я ў майстра вялікая, дзяцей трэба карміць. І, каб не бачыць, як яны пакутліва гінуць, ён сабраўся рашыць праблему кардынальна: атруціць дзяцей, жонку і самога сябе. І вось сніцца яму сон: сівы прыгожы стары загадвае не рабіць тое, што ён задумаў, а пайсці па канкрэтным адрасе і купіць там ікону. «Купіш — выжывеш», — пабяцаў старац і знік. Мужчына пайшоў і сапраўды за сімвалічную плату яму прадалі ўбогі абразок — цёмны, маленькі. Дома ён зняў чорны ад сажы аклад і абамлеў — гэта ж чыстае золата. На грошы, выручаныя за каштоўны метал, сям'я і жыла. Мужчына быў упэўнены, што жыццё яму выратаваў святы Мікалай.

Яшчэ адна вельмі ўшанаваная святыня храма — спіс іконы Маці Божай Казельчанскай, падораны апошняй ігуменняй Казельчанскага манастыра матушкай Феафаніяй. Яна памерла ў канцы 1960-х, а перад смерцю перадала цудадзейны абраз настаяцелю Свята-Мікольскага храма айцу Анатолю.

— Ёй моляцца аб сямейным шчасці, — удакладняе бацюшка. — Вунь дары тых, чые малітвы былі пачутыя...

Ікона размешчана над царскімі дзвярыма, і айцец Сава спецыяльна апускае яе, каб мы змаглі да яе прыкласціся і папрасіць Божую Маці аб чымсьці сваім, асабістым.

## «Звяздоўскі» звон

З айцом Савам дакладна не засумуеш. Ён любіць бянтэжыць рознымі прымаўкамі і прыслоўямі. Не адразу разумееш, дзе ён жартуе, а дзе кажа праўду. Вось і зараз змоўніцкім тонам прапануе схадзіць на званіцу.



Старазапаветны сюжэт нагадвае вернікам, што Бог таксама быў чалавекам.

Мы, зразумела, за. Падымаемся па вінтавой лесвіцы ў прадчуванні яшчэ чагосьці вельмі захапляльнага.

— Зараз паслухаем, як гучыць Благавест, — кажа свяшчэннік і бярэцца за вяроўку. Густы дрыжачы бас скаланае наваколле і напаўняе прыемнай вібрацыяй цела. Ён націскае педаль і рознакаліберныя званы пачынаюць перакліквацца паміж сабой, складаючыся ў гарманічную ўзнёслую мелодыю.

Кожнаму хочацца паспрабаваць. «На якую педальку націскаць?» — пытаемся ў бацюшкі. «Тут усё проста, — смяецца ён. — Счапленне, тормаз».

— А праўда, што жанчынам дазваляецца званіць толькі на Вялікдзень, — спрабую прадэманстраваць сваю, як мне здаецца, дасведчанасць.

— Толькі па горадзе забаронена, — усміхаецца бацюшка, намякаючы на тэлефон. — Таму што доўга размаўляеце.

Усе смяюцца. А айцец Сава зноў інтрыгуе: «У нас якраз звоняць жанчыны. Яны манастырскія, выхаваныя ў глыбокай строгасці. Ніколі не бачылі мабільных тэлефонаў і не абразалі пазногцяў». Потым ужо сур'ёзна дадае: «Насамрэч гэта звычайныя прыхаджане, якія проста жадаюць гэтым займацца».

## Пад заступніцтвам святога Дыянісія

Яшчэ адзін храм Мікольскага манастыра пабудаваны ў гонар святога Дыянісія Раданежскага. Ён прызначаны для хрышчэння. Унутры цёпла і ўтульна — па баках ад іканастаса дзве печкі, абкладзеныя кафляй аж з Піцера. Пасярэдзіне купель для новнароджаных. Храм, дарэчы, пабудаваны на сродкі беларускіх нафтавікоў, выглядае багата. Іканастас напісаны ў Данілавым манастыры. А вось іконы па баках — веткаўскага пісьма. «Наш былы настаяцель быў са старавераў», — удакладняе айцец Сава.

— А як вы ставіцеся да старавераў? — пытанне само зрываецца з вуснаў.

— Я ўзяў сабе за правіла пасля 40 гадоў нічога не абагульняць, — адказвае ён. — Мне ў першую чаргу цікавы чалавек. Сярод старавераў у мяне былі і добрыя знаёмыя, і не вельмі. Як і сярод праваслаўных, каталікоў і прадстаўнікоў іншых канфесій. Мне цікавы змест, а не форма. Калі кажуць, што абрад выратавальны — гэта поўны абсурд. З таго, што я правільна кладу паклоны, не выцякае, што я добры чалавек. Стараверства мне цікава як з'ява культуры або гісторыі. У мяне ёсць сябры нават сярод атэістаў. Мы сябруем і знаходзім агульную мову.

Айцец Сава наогул незвычайны манах. Яго цікавіць усё — культура, гісторыя, філасофія, жыццё ва ўсіх яго праявах. Ён сыпле імёнамі, назвамі, цытатамі. І так хочацца даведацца, што ён думае пра пытанні, якія хвалююць кожнага з нас. Чаму становяцца манахамі? Ці ёсць надзея на моладзь? Або, напрыклад, як ён ставіцца да экуменізму? Спрэчкі на гэтую тэму вядуцца бясконца.

— Адмоўна, — адразу становіцца ён сур'ёзным. — Рэлігія — гэта культурная ўніверсалія. Спроба ўсіх аб'яднаць закончыцца стварэннем яшчэ адной рэлігіі. Людзі традыцыйнай культуры, кансерватары ніколі гэтага не прымуць. Тут зноў жа галоўнае не форма, а змест. І атэізм можа быць рэлігійным, і філасофія таксама. Калі вы з дапамогай формы жадаеце памірыць людзей, нічога не атрымаецца. Але такіх спроб было шмат. Піфагарэйскія абшчыны на Сіцыліі існавалі яшчэ ў VI стагоддзі да нараджэння Хрыстова. Яны былі цалкам арганізаваныя, як манастыры.

— Але ж сённяшняе пакаленне наогул жыве, здаецца, не задумваючыся, ім нічога не цікава, акрамя саміх сябе...

— Гэта ўсё няпраўда. Мы зноў усё абагульняем і памыляемся. Як было б сумна, калі б маладыя былі аднолькавыя. Меней за ўсё пра дзяцей ведаюць бацькі. Адна знаёмая расказвала, што да яе ў сацыяльных сетках «дадалася» маці. Убачыла зробленае ёй фота і першы раз за ўсё жыццё пахваліла. Калі ёсць пытанні з дзяцей, гэта праблема не з імі, а з іх бацькамі. А наконт веры — тут ніколі не трэба фарсіраваць. Прыйдзе час, чалавек паспее сам. Мяне радуюць маладыя студэнты, вучні. Яны больш спакойныя, чым «перабудовачнае» пакаленне. Больш раскаваныя, глядзяць шырэй на рэчы. Яны проста іншыя. Гэта пакаленне, якое сябе яшчэ пакажа.

Пытанняў усё яшчэ шмат, але час бяжыць несупынна і трэба ісці. Напаследак заходзім у кніжную краму. Хочацца, каб хоць нешта яшчэ, акрамя ўспамінаў, нагадвала аб гэтай сустрэчы. І — грэла.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Жыллё

# ТОП-5 НАЙЛЕПШЫХ КВАТЭР МІНСКА

## Папярэднія вынікі 2017-га на рынку доўгатэрміновай арэнды жылля

Эфіопія (раней Абісінія) — насамрэч калыска чалавецтва. Пра гэта сведчаць выкапнёвыя астанкі аўстралапітэкаў, выяўленыя ў даліне ракі Ома. Эфіопія з'яўляецца адзінай краінай Афрыкі, якая ніколі не была каланізаваная — толькі акупаваная італьянцамі на працягу некалькіх гадоў падчас Другой сусветнай вайны.

У пасляваенны час імператар Хайле Селасіе I працягваў самадзяржаўнае праўленне. Цікава, што паслядоўнікі растафарыянства (рэлігійная і сацыяльная плынь, якая зарадзілася на Ямайцы ў 1930-я гады) лічаць гэтага імператара месіяй. Нават назва рэлігіі ўтворана ад тытула і імя, якое ён насіў да каранацыі, — Рас Тафары Маконен. У канцы 1940-х Хайле Селасіе выдзеліў участак зямлі ў горадзе Шашэмэне для членаў Сусветнай эфіопскай федэрацыі, якія ваявалі супраць італьянцаў падчас Другой італа-эфіопскай вайны. Многія з тых, хто пераехаў туды, былі растафарыяне. Паводле інфармацыі Assosiated Press, цяпер у Эфіопіі жывуць каля тысячы растафарыян.

Да пачатку 1970-х гадоў рэжым стаў зусім адыёзным: імператара крытыкавалі з усіх бакоў палітычнай прасторы. Каталізатарам далейшых падзей стала масавая гібель людзей ад голаду ў 1972—1974 гадах. У 1974-м меры па аздараўленні эканомікі выліліся ў рэзкае павышэнне цэн і выклікалі масавыя дэманстрацыі пратэсту. Сітуацыю выкарысталі афіцэры, якія схіляліся да марксізму, — групоўка «Дэрг» узнікла летам таго ж года. Пайшоў працэс дэмантажу манархіі, вядомы як «паўзучы пераварот». Да сярэдзіны восені «Дэрг» падпарадкаваў сабе ўсе адміністрацыйныя рэсурсы і абвясціў курс на пабудову сацыялізму. У 1976—1977 гадах групоўка ўмацоўвала свае пазіцыі шляхам тэрору — як супраць раялістаў і сепаратыстаў, так і супраць левых. Практычна адразу пачалася грамадзянская вайна. Лідарам «Дэрга» стаў Менгісту Хайле Марыям. У 1975—1991 гадах СССР і некаторыя краіны Усходняй Еўропы аказвалі ўсебаковую дапамогу рэжыму Менгісту.

Палітыка на пабудову сацыялізму прывяла Эфіопію да поўнага спусташэння. Праведзеная калектывізацыя сельскай гаспадаркі спрыяла далейшай дэградацыі рэжыму. У 1984 годзе ў краіне ад голаду памерла мільён чалавек. Ва ўмовах крызісу ў СССР урад Менгісту быў зрынуты ў маі 1991-га. Галоўную ролю ў паўстанцкім альянсе адыгралі эрытрэйскія групоўкі. У 1993-м аддзялілася Эрытрэя, і Эфіопія страціла выхад да мора. Да ўлады прыйшла групоўка марксістаў вельмі левага толку, якая пасля змяніла ідэалагічную арыентацыю на больш ліберальную. Краіну з тых часоў да сваёй смерці ў 2012 годзе ўзначальваў прадстаўнік гэтай групоўкі Мелес Зенаўі, спачатку ў якасці прэзідэнта, потым, пасля ўвядзення парламенцкай рэспублікі, як прэм'ер-міністр.

### КАВА І ТУРЫЗМ

У 2000-х у краіне адбыліся змены да лепшага. Эканоміка хутка прырастае, і, нягледзячы на цяперашнія палітычныя ўзрушэнні, МВФ лічыць, што добрыя часы працягнуцца. У 2000 годзе Эфіопія, другая па колькасці насельніцтва краіна ў Афрыцы, была трэцяй найбяднейшай дзяржавай у свеце. Яе гадавы ВУП у разліку на душу насельніцтва складаў усяго $650. Больш за 50% эфіопаў жыло за мяжой беднасці. Але пасля здарыўся сапраўдны цуд. Паводле ацэнак МВФ, з 2000 па 2016 год Эфіопія з пункту гледжання ВУП на душу насельніцтва была трэцяй самай хуткарослай эканомікай у свеце сярод краін з насельніцтвам у 10 млн і больш чалавек. Да 2011-га ўзровень беднасці ў краіне знізіўся да 31%.

Далейшая перспектыва вельмі аптымістычная. У сваім апошнім глабальным прагнозе МВФ адзначыў, што ВУП Эфіопіі на душу насельніцтва будзе павялічвацца са штогадовым тэмпам у 6,2% да 2022-га. Сярод краін з насельніцтвам у 10 млн і больш чалавек толькі Індыя і М'янма будуць расці хутчэй. ААН прагназуе, што да 2050 года насельніцтва краіны вырасце да 190 млн чалавек. Сёння яно складае прыкладна 100 млн, што робіць яе адной з самых хуткарослых буйных краін па колькасці насельніцтва.

Эканоміка Эфіопіі засяроджаная ў сектарах паслуг і сельскай гаспадаркі. Паводле ацэнак Сусветнага банка, сярэднегадавы прырост у 10,8%, зафіксаваны Эфіопіяй у перыяд паміж 2004 і 2014 гадамі, быў атрыманы ў такіх галінах, як гасцінічны бізнес і транспарт, што было ў асноўным вынікам урбанізацыі краіны. Вытворчасць, якая складае хай і невялікую частку эканомікі, актыўна развіваецца — павялічваецца больш чым на 10% у год. Тым часам на сельскую гаспадарку за гэты перыяд, паводле даных Міжнароднага навукова-даследчага інстытута харчовай палітыкі, прыпадала 3,6% штогадовага росту. Сярод важных экспартных пазіцый — кава. Гэтая культура — гонар Эфіопіі. Тут распрацаваны цэлыя рытуалы накшталт кітайскіх чайных цырымоній — ад абсмажвання кававых зярнят да дэгустацыі напою. У краіне вырабляюць толькі арабіку, у прыватнасці гатункі «джымі» і «харарэ». Эфіопская кава расце на вышынях ад 1100 да 2100 метраў над узроўнем мора. Эфіопія — адзін з асноўных вытворцаў кавы ў свеце і ў Афрыцы (больш за 20% кантынентальнага збору). Згодна з легендай, першаадкрывальнікам унікальных уласцівасцяў кававага дрэва стаў эфіопскі пастух Калдзім прыблізна ў 850 годзе. З Эфіопіі кававы напой распаўсюдзіўся па ўсім Блізкім і Сярэднім Усходзе. Да XIX стагоддзя гэтую культуру ўпадабалі ў Італіі, Інданезіі і Амерыцы.

Сярод найбольш перспектыўных галін эфіопскай эканомікі — турызм. Нездарма вядомае міжнароднае выдавецтва «Lonely Planet» паставіла гэтую краіну на першае месца ў дзясятцы найлепшых сусветных турыстычных напрамкаў мінулага года. Найбагацейшая гісторыя і старажытная культура, каўчэг Старога Запавету і адзіныя ў Афрыцы замкі імперскіх гарадоў, нацыянальныя паркі і астраўныя манастыры монафізітаў — усё гэта Эфіопія. Тут жыццё настолькі цесна знітаваная з гісторыяй, што падзеі біблейскіх часоў здаюцца зусім блізкім мінулым. Дарэчы, у Старым Запавеце згадваецца, што адна з рэк, што дасягала Раю, працякала менавіта па землях эфіопаў. Тысячы турыстаў кожны год з'язджаюцца паглядзець, як праваслаўныя жыхары праводзяць святочныя абрады ў высечаных у скале цэрквах (вельмі адметна тут праходзяць Раство і Хрышчэнне). Акрамя экскурсійнага турызму ў Эфіопіі развіты лячэбны. Тут размешчана мноства мінеральных крыніц, галоўным чынам у цэнтры краіны. Адметна, што ў Эфіопіі быў адкрыты першы ў Афрыцы пяцізоркавы гатэль. Апошнім часам урад краіны ўсё больш актыўна падтрымлівае развіццё турызму.

### ПРАЕКТ X

Павышэнне ўзроўню адукацыі насельніцтва, палепшаная інфраструктура і інвестыцыі з Кітая даюць Эфіопіі шанц заняць сваё месца сярод самых яркіх гісторый развіцця краін у свеце. Колькасць дзяцей, якія прымаюцца ў пачатковыя школы, вырасла з 20 да 90 працэнтаў. Уладам удалося падвоіць агульную даўжыню дарог і ў чатыры разы павялічыць колькасць выпрацаванай энергіі. Прычым стаўка робіцца на аднаўляльныя крыніцы. Гэты рэгіён характарызуецца адным з самых высокіх паказчыкаў вулканічнай актыўнасці на Зямлі. У Эфіопіі больш за 60 вулканаў. Некаторыя з іх актыўныя і дагэтуль. Вулкан — эквівалент некалькіх мільёнаў сонечных батарэй або, у сярэднім, прыкладна 500 ветравых турбін. Агульны нявыкарыстаны рэсурс спецыялісты ацэньваюць у 10 ГВт. Падобная мадэль электрыфікацыі — сапраўдны цуд для Эфіопіі: яна не толькі мінімальна забруджвае навакольнае асяроддзе, але і на самай справе можа забяспечыць электрычнасцю ўсё мясцовае насельніцтва і дапамагчы людзям вырвацца з галечы.

У актыўнай распрацоўцы і гідрарэсурсы. ГЭС Grand Ethiopian Renaissance Dam (у Эфіопіі яе коратка называюць «Хідасэ» — на мясцовай амхарскай мове «адраджэнне», а ў міжнароднай публіцыстыцы — «Праект X») будзе больш магутная, чым Саяна-Шушанская ГЭС у Расіі, што само па сабе характарызуе маштабы аб'екта і амбіцыі будаўнікоў. Агульны каштарысны кошт падбіраецца ўжо да 10 млрд эфіопскіх быр (5 млрд долараў) — амаль 10% ВУП краіны. Для Эфіопіі «Хідасэ» ператварыўся ў нешта накшталт нацыянальнай ідэі. «Плаціна, якую мы будуем, уваходзіць у лік мегапраектаў не толькі Афрыкі, але і ўсяго свету, становячыся крыніцай нашага нацыянальнага гонару», — заўважыў прэм'ер-міністр краіны Хайлемарыям Дэсалень. Ад беднай дзяржавы такі маштабны інфраструктурны праект запатрабаваў непамернага напружання сіл. Каля двух мільярдаў долараў уклалі кітайскія банкі, а астатнюю суму эфіопы, зацягнуўшы паясы, нейкім чынам прымудрыліся набраць самі з пэўным удзелам Афрыканскага банка развіцця.



Разведачныя і праекціровачныя работы праводзіліся амерыканцамі ў 2010 годзе ў сітуацыі найстражэйшай сакрэтнасці (адсюль і «Праект X»), а тэндар на будаўніцтва выйграла італьянская фірма Salini Costruttori. Аднак усе выдаткі абяцаюць акупіцца шматкроць, што зробіць Эфіопію другім на кантыненце вытворцам электраэнергіі пасля ПАР і выведзе яе ў галоўныя рэгіянальныя гульцы, у тым ліку і ў палітычным плане, адкінуўшы назад ранейшага безумоўнага лідара — Егіпет. За эфіопаў уступіліся ўсе афрыканскія краіны на поўдзень ад яе, бо разлічваюць атрымліваць танную электраэнергію ад «Праекта X» — Танзанія, Кенія, Руанда, Уганда і Бурундзі. Пасля да гэтай кааліцыі таксама падключыліся Паўднёвы Судан і Джыбуці, якія фармальна не ўваходзяць у басейн Ніла, але таксама спадзяюцца на танны энергарэсурс. Егіпет апынуўся ў ізаляцыі. Ад яго стаў адварочвацца нават Судан, на мяжы з якім эфіопы і ўзводзяць гіганцкую плаціну. Хартум у аднабаковым парадку адмяніў «Стратэгічны пакт» з Каірам, які шмат у чым дубляваў каланіяльныя пагадненні, за што Адыс-Абеба паабяцала ўзвесці на тэрыторыі Судана «контрплаціну» і падзяліцца прыбыткам.

Даследаванне, праведзенае Цэнтрам глабальнага развіцця, аналітычным цэнтрам ЗША, паказала, што Эфіопія, хутчэй за ўсё, стане «новым Кітаем» у Афрыцы. Павышэнне ўзроўню адукацыі насельніцтва, развіццё інфраструктуры і інвестыцыі з Кітая даюць Эфіопіі шанц заняць пачэснае месца сярод самых яркіх гісторый развіцця краін у свеце. Пры гэтым афрыканская дзяржава сутыкаецца з цэлым шэрагам праблем. Напрыклад, апошнім часам абвастрылася канфрантацыя паміж народнасцю арома і этнічнымі самалійцамі на паўднёвым усходзе краіны. Калі Эфіопія зможа пераадолець палітычную нестабільнасць, эканамічныя магчымасці, лічаць эксперты, будуць велізарныя.



**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

■ На сцэне

# «БЕЛАСНЕЖКА» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ДАРОСЛЫХ

### Тэатр лялек ставіць казку братоў Грым

**Якраз у калянавагодні час, калі любое відовішча з падаючым снегам аказваецца такім дарэчным, у рэпертуары Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек з'явілася вельмі сімпатычна ўвасобленая казка братоў Грым «Беласнежка». Ручаюся, што прагляд спектакля, прызначанага для публікі ад пяці гадоў, стане прыемным баўленнем часу і для дарослага чалавека, што пацвярджаецца маім выпадкам. Хоць пастаноўка прытрымліваецца сюжэта, не прапануе сучаснага «прачытання», не насычае герояў псіхалагізмам. Здавалася б, сапраўды казка для дзяцей...**

Новую «Беласнежку» паставіў рэжысёр Ігар Казакоў — аўтар, здольны разбурыць пашыраны ў нашым грамадстве стэрэатып пра быццам прызначаны для малодшай публікі лялечны тэатр. «Гамлет» Уільяма Шэкспіра, «На дне» Максіма Горкага, «Сіняя-сіняя» Уладзіміра Караткевіча — усё аказалася на сцэне Магілёўскага абласнога тэатра лялек, дзе сёння Ігар Казакоў з'яўляецца галоўным рэжысёрам. Памятаючы пра гэтыя творчыя дасягненні, мімаволі шукаеш глыбока схаваны падвох, але не — Ігар Казакоў мае не менш значны бэкграўнд і ў сферы спектакляў для дзяцей, аісціны яго «Беласнежкі» не складанейшыя за казачную мараль. Спектакль адыходзіць цудоўнаму жанру забавы — простай, мяккай і пяшчотнай, а вонкаваму выглядў пастаноўкі надаецца асаблівая роля.

Адпаведна ўсюдыіснаму сюжэту, адным зімовым вечарам Каралева ўкалола палец і выказала пажаданне, каб у яе было дзіця «белае, як снег, румянае, як кроў, і чарнявае, як чорнае дрэва». Такой нарадзілася Беласнежка, маці памерла, жонкай караля стала фанабэрыстая жанчынка, што размаўляе з люстэркам. У рэшце рэшт пры́гажосць дзяўчыны стала раздражняць мачыху і Беласнежка вымушана была бегчы ў лес, дзе трапіла да гномаў, укусіла атручаны яблык, упала ў забыццё і была выратавана Каралевічам, які, убачыўшы яе, закахаўся.

У спектаклі Ігара Казакова казку расказваюць самі гномы: яны з'яўляюцца на сцэне ў самым пачатку пастаноўкі, сварацца, забаўляюцца, уключаючыся ў гісторыю, уплываюць на развіццё падзей, нехта пераходзіць у новыя ролі так, што гномаў меншае. Карацей, усё, што адбываецца на сцэне, — выключна гномаў свет і гномава апавяданне, нават галоўныя героі — Каралева, Беласнежка і Каралевіч — першапачаткова з'яўляюцца ў вобразе гномаў. Такім чынам захоўваецца рытуал апавядання дзіўных гісторый, калі мы адразу ідэнтыфікуем расказчыка і абстрагуемся ад казкі, не дазваляючы сабе захрасць у ёй і спужацца страшнага люстэрка. Рэжысёр жа адышоў ад спрошчанага лінейнага ўвасаблення на сцэне казкі братоў Грым і ўскладніў спектакль, захаваўшы сюжэт.


Фота Станіслава ВІГДОРЧЫКА.

Сапраўды, асобную ўвагу варта звярнуць на візуальны складнік пастаноўкі і на тое, як рэжысёр пабудаваў мізансцэну: чаго вартыя падаючы снег, злавесныя моманты і тое, як на сцэне суіснуюць расказчыкі і казка, антуражам і персанажамі якой займаюцца самі расказчыкі. Мастаком-пастаноўшчыкам «Беласнежкі» стала лаўрэат Нацыянальнай тэатральнай прэміі і галоўны мастак Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Таццяна Нерсісян, кампазітарам — Аляксандр Літвіноўскі, тэксты песень напісалі Рыгор Гольдман і Аляксандра Даньшова, харэаграфію паставіла Валерыя Лук'янцава.

У выніку мы маем быццам вядомы сюжэт, але змешчаны ўнутр сусвету гномаў, настолькі ж казачнага. Жудасную насамрэч гісторыю ў часам злавесным увасабленні, але ўраўнаважаную гарэзлівасцю гномаў. Казку для дзяцей, ад якой і дарослыя акажуцца ў захапленні. У сучасным рэпертуары гэта той спектакль, падчас якога можна ўсміхнуцца, зацаніць візуальныя рашэнні і насуперак стэрэатыпам пра дзіцячы лялечны тэатр проста атрымаць задавальненне.

Уражанні ад свят пройдуць, а снег на сцэне лялечнага тэатра, на шчасце, усё яшчэ будзе ісці. У найбліжэйшы час «Беласнежка» будзе паказвацца ў лялечным у студзені і лютым ■

■ На экране

# АБЫЯКАВАСЦЬ БУРЖУАЗНАЙ СЯМ'І І АЛЕНІ Ў СНАХ

### Чарговая партыя добрага кіно ад праекта «Лістапад. Калекцыя»

**Тэзіс пра тое, што «Лістапад» — гэта «свята, якое заўсёды з табой», набывае і літаральны сэнс. Калі сам фестываль застаецца ў мінулым, яго каманда ў рамках праекта «Лістапад. Калекцыя» працягвае паставляць на вялікі экран сусветныя хіты і найцікавейшыя прыклады сучаснага аўтарскага кінематографа. Першы месяц новага года будзе багаты: у сталічных кінатэатрах з'явяцца знаходкі Канскага кінафестываля, сенсацыі года, уладальнік «Залатога мядзведзя» і Прыза ФІПРЭСІ Берлінскага кінафестывалю, а таксама фільмы жывога класіка Міхаэля Ханеке.**

Пад знакам імені праслаўленага аўстрыйскага рэжысёра і праходзіць гэты кінамесяц: у сталічных кінатэатрах можна будзе паглядзець апошні фільм Міхаэля Ханеке «Хэпі-энд», якому будуць спадарожнічаць яго ж карціны «Піяністка» з Ізабэль Юпер у галоўнай ролі і «Каханне» з Жанам-Луі Трэнціньянам і Эмануэль Рыва. «Хэпі-энд», дарэчы, сёлета намінаваўся на галоўны прыз Канскага кінафестывалю, як і безліч іншых работ рэжысёра, толькі саступіў «Квадрату» шведскага аўтара Рубена Эстлунда. Затое «Каханню» «Залатую пальмавую галіну» прысудзілі, у 2012 годзе, больш за тое — карціна атрымала Оскар як «Найлепшы фільм на замежнай мове». «Піяністка» ж, таксама намінаваная на «Залатую пальмавую галіну», атрымала Гран-пры журы, а фестываль адзначыў ролі незямной Ізабэль Юпер і прыгажунчыка Бенуа Мажымеля.

У фільме «**Хэпі-энд**» расказваецца пра багатую французскую сям'ю, абыякавасць і бездэмацыянальнасць якой выяўляецца на фоне мігранцкага крызісу. Ханеке далікатна закрануў актуальную тэму — мігрантаў, але завёў гісторыю зусім пра іншае. Адну з галоўных роляў у фільме — дзядулі Жоржа — выканаў непараўнальны Жан-Луі Трэнціньян, зорка фільмаў Бернарда Берталучы, Эрыка Рамера, Ражэ Вадзіма, Франсуа Труфо, Клода Лелуша і, вядома, Міхаэля Ханеке. У фільме задзейнічана таксама Ізабэль Юпер.



**Глядзець фільм «Кліч мяне сваім імем» варта дзеля рэжысёрскай вытанчанасці, візуальнай прыгажосці і танца Олівера пад кампазіцыю гурта The Psychedelic Furs.**



Зоркай жа мінулага Берлінскага кінафестывалю апроч новай карціны фіна Акі Каўрысмякі стаў фільм венгерскай аўтаркі Ільдзіка Энэдзі «**Пра цела і душу**». У Берліне ён атрымаў чатыры ўзнагароды, у тым ліку «Залатога мядзведзя», а Андрэй Плахаў назваў яго прэтэндэнтам на званне самага небанальнага фільма года. Дзеянні адбываюцца на бойні, дзе працуюць галоўныя героі — Марыя з расстройствам аўтыстычнага спектра і адзінокі Эндрэ з дэфектам левай рукі. У пэўны момант яны даведваюцца, што ім сняцца падобныя сон, дзе яны сустракаюцца ў лесе ў вобразе закаханых аленяў, і з гэтага пачынаецца іх раман — раман на бойні.



Сенсацыяй называюць карціну італьянскага рэжысёра Лукі Гуаданьіна «**Кліч мяне сваім імем**», упершыню прадстаўленую на кінафестывалі «Сандэнс», пасля чаго — на Берлінале. Фільму прадказваюць некалькі намінацый на Оскар, узнагароды «Залаты глобус», і, канешне, кожная краіна хоча атрымаць гэты хіт у свой пракат. Па сюжэце прафесар і яго сям'я, у тым ліку 17-гадовы сын Эліа, праводзяць лета на сямейнай віле, куды прыязджае асістэнт прафесара, малады вучоны Олівер. Глядзець фільм «Кліч мяне сваім імем» варта дзеля рэжысёрскай вытанчанасці, візуальнай прыгажосці і танца Олівера, якога іграе здольны скарбыць з першага погляду Армі Хамер, пад кампазіцыю гурта The Psychedelic Furs. Ужо цяпер можна прасачыць за лёсам карціны: цырымонія ўзнагароджвання прэміі «Залаты глобус» адбудзецца заўтра, 7 студзеня.

Паказы фільмаў праекта «Лістапад. Калекцыя» ў асноўным будуць праходзіць у кінатэатрах «Піянер», «Цэнтральны» і Falcon Club Буцік Кіно ■

Матэрыялы падрыхтавала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

■ Мінскія хронікі

# «ВЕЧАРЫ РВАНАЙ ГАЛЁШЫ» І НАЙЛЕПШЫ ДЖАЗ

## Дзе і як у савецкі час танцавалі мінчане

**Першае дзесяцігоддзе пасля ўтварэння СССР многія звыклыя раней паняцці былі прызнаныя цалкам чужымі новаму савецкаму будаўніцтву, іх лічылі дробнабуржуазным, шкодным перажыткам. Акрамя самога інстытута сям'і ў няміласць сярод іншага трапілі танцы і нават дзіцячыя цацкі. У пачатку 20-х былі забаронены ўсе лялькі, акрамя ідэалагічна накіраваных. Існавала нават серыя выродлівых пародый на дзеячаў духавенства і буржуазію, але за адсутнасцю альтэрнатывы дзеці пачалі з трапятаннем ставіцца і да іх. Прызнаўшы магутныя прыродныя сілы ў чалавеку, да пачатку 30-х з радыкальнымі эксперыментамі скончылі. І ўсё ж нават у танцаў была свая адмысловая афарбоўка...**



Ежы Пецярсбурскі.



Марк Кац падчас заняткаў.

### Мінск на сусветнай танцавальнай карце

Не так даўно **краязнаўца Вадзім ЗЕЛЯНКОЎ** падзяліўся цікавай «знаходкай» у газеце «Звязда» за 1930 год. Здавалася б, нічога незвычайнага: нататка пра тое, што Мінскі клуб друкароў сумесна з юнсекцыяй арганізуе мерапрыемства. У праграме — канцэрт з удзелам артыстаў ленінградскіх і маскоўскіх тэатраў, балетнае аддзяленне, сімфанічны аркестр, а таксама духавы аркестр музыкі, прысутнасць якога прадугледжвала танцы. Здзіўленне выклікае іншае — утыльвіктарына з прызамі. Дарэчы, менавіта гэты пункт выдатна карэлюе з назвай самога мерапрыемства «Вялікі вечар ірванай галёшы». Аказалася, такія, як цяпер модна казаць, «івэнты» былі ў пачатку 30-х распаўсюджаныя па ўсім Савецкім Саюзе, падобны эпізод нават згадваецца ў аповесці Андрэя Платонава «Катлаван». Закліканы яны былі нестандартным чынам вырашыць новую стратэгічную задачу — масавы збор утылю. Каб папасці на вечарыну, неабходна было папярэдне здаць не менш за два кілаграмы адходаў на перапрацоўку, сярод якіх высока цаніліся старыя галёшы. Праўда, фармат мерапрыемства асабліва не прыжыўся.

Пра альтэрнатыву падобных вечарынак расказала **мастацтвазнаўца Таццяна БЕМБЕЛЬ**. Яе саму пабольш даведацца пра танцавальную культуру падштурхнуў міжнародны танга-марафон, які праводзіўся ў Мінску. Аказваецца, за апошнія пяць гадоў беларуская сталіца трывала зацвердзілася на агульнасусветнай карце сацыяльных танцаў — тых, якімі займаюцца не дзеля спаборніцтваў, а дзеля задавальнення. Аматары штотыдзень збіраюцца ў рэстаране, размешчаным у будынку Купалаўскага тэатра.

Але што ж было раней? У даваенны перыяд і першыя пасляваенныя гады часцей за ўсё танцавалі мінчане не ў рэстаранах — іх наведванне маглі дазволіць сабе адзінкі, — а на хатніх вечарынках. Гэта ж правіла распаўсюджвалася і на высокапастаўленых асоб сталага ўзросту. Ставілі патэфон, мянялі пласцінкі... Хатняе танцаванне было кампенсацыяй таго, што людзі недаатрымлівалі ў іншых грамадскіх прасторах.

### Танцы строем пад партрэтам Сталіна

І ўсё ж жыццё Мінска ў тыя гады нельга было назваць сумным. Вялікія перамены прынёс 1939 год, калі сюды трапілі музыкі з далучанай Заходняй Беларусі і Польшчы, дзе была добра развітая культура кабарэ. На некаторы час тут нават абасноўваўся найлепшы ў СССР джазавы бігбэнд.

А ўзначаліў яго той, хто, здаецца, вядомы абсалютна кожнаму, але не па імені, а па сваіх творах — Ежы або Гары, як яго потым называлі, Пецярсбурскі. Напрыклад, танга «Остатня нядзеля», якое заваявала ўвесь свет, мы ведаем пад назвай «Стомленае сонца».

Дарэчы, Ежы Пецярсбурскі да самога Пецярбурга ніякага дачынення не меў: ён быў родам з Варшавы, з сям'і музыкаў. Па маці яго прозвішча было Меладыст, бо шматлікія продкі з гэтага боку займаліся клезмерскай музыкай — гэта традыцыя імправізацыі на многіх інструментах адначасова, вельмі блізкая да джаза. Менавіта таму, калі хвалі эміграцыі адна за адной пайшлі ў Амерыку, многія яўрэйскія музыканты так натуральна ўліліся ў джаз — яны ўжо ўмелі гэта рабіць, проста пад іншай назвай.

Ежы скончыў варшаўскую кансерваторыю як піяніст, а пасля гэтага яшчэ адвучыўся ў венскай кансерваторыі таксама як піяніст, а яшчэ як дырыжор і кампазітар. Для музыкі такога ўзроўню Мінск здаваўся безнадзейнай правінцыяй, але іграць усё роўна трэба было. Таму ён сабраў групу з 25 чалавек, якую пазней узначаліў Эдзі Рознер, які таксама прыйшоў сюды з тэрыторыі былой Польшчы. Гэта чалавек, якога называюць вялікім трубачом, дырыжорам і шоуменам — зорка сусветнай велічыні.

Бігбэнд быў страшэнна папулярны, у філармонію было не трапіць. Дарэчы, тады яна знаходзілася ў будынку цяперашняга кінатэатра «Перамога». Гэта быў клуб, які выконваў філарманічныя функцыі, паколькі ў Мінску было не так шмат каменных збудаванняў з добрай акустыкай. На гэтай жа сцэне выступалі не толькі яны, але і Леанід Уцёсаў і Клаўдзія Шульжэнка, якія ездзілі з канцэртамі па ўсёй Беларусі, асаблівую ўвагу аддаючы заходняй яе частцы. Трэба было паказаць, што краіна адзіная, так праз музыку вырашаліся палітычныя пытанні.

Аднак мела гэта і адваротны бок. У нацыянальным архіве захоўваюцца кадры, дзе ў тым самым кінатэатры «Перамога» пары «строем» танцуюць пад партрэтам Сталіна. Тады было прынята танцаваць перад праглядам кінастужкі. Пра танцы не забыліся і падчас вайны. Людзі нават у палявых умовах супрацьпастаўлялі хвілінны настрой пастаянна пануючаму вакол жаху. А вось у пасляваенны перыяд «класічнай» стала карціна танцуючых адна з адной на грамадскіх пляцоўках дзяўчат ці жанчын — занадта шмат мужчын загінула.

### Фільм, увасоблены ў рэальнасць

Дарэчы, Ежы Пецярсбурскі выступаў і на фронце, пазней яго ўзялі на радыё, якое транслявала музычныя перадачы. Разам з войскам Андэрса ён апынуўся ў Афрыцы, адкуль эміграваў у Аргенціну, дзе 20 гадоў працаваў капельмайстрам вялікага аркестра, напісаў шмат твораў і ўнёс вялікі ўклад у аргенцінскую музыку. Але на радзіму яго заўсёды цягнула, таму ў 1970-я ён вярнуўся ў Варшаву і нават паспеў, ажаніўшыся з маладой опернай спявачкай, пакінуць нашчадка.

Аднак выпрабаванняў на яго долю выпала дастаткова, адно з іх — замоўчванне імені. А звязана гэта з папулярнасцю яго музыкі як у савецкім, так і ў нямецкім войсках. Ежы, дарэчы, у мінскі перыяд напісаў песню «Сіняя хустачка» — у ваенны перыяд вальс у выкананні Шульжэнкі адразу ж атрымаў велізарную вядомасць. Але па іроніі лёсу як для савецкай арміі адной з галоўных сімвалічных песень стала «Сіняя хустачка», так для нямецкіх салдат — танга, вядомае пад назвай «О, донна Клара». Толькі ўявіце — таго ж аўтара. Атрымлівалася, што дзве арміі, якія ваявалі між сабой, бесперапынку слухалі музыку аднаго кампазітара. На шчасце, зараз справядлівасць перамагла, і нотныя зборнікі выдаюцца пад імем аўтара.



Эдзі Рознер.

Гісторыя, шмат у чым блізкая да жыцця кампазітара, паказаная ў фільме Эфраэма Севелы «Папугай, які гаварыў на мове ідыш», знятага сумесна СССР і ФРГ у 1990 годзе. Дзеянне карціны адбываецца ў Вільні, але ў аснове ляжыць адно — людзі, якія апынуліся паміжваламі гісторыі.

Лёс Эдзі Рознера склаўся больш трагічна. Пасля вайны сабраны зноў аркестр праіснаваў нядоўга. Гэта звязваюць са стратай уплыву Панамарэнкі, які адчуваў сантымент да джазавай музыкі і таму аберагаў яе выканаўцаў. Не прайшло і двух гадоў пасля вайны, як пачалася актыўная барацьба з буржуазнымі павевамі, Эдзі Рознера на восем гадоў адправілі ў лагер, дзе ён прабыў да смерці Сталіна.

Тым не менш музыка з жыцця гараджан не знікала ніколі. У 1965 годзе ў Мінск пераехаў Марк Кац, які адкрыў студыю танца ў ДК аўтазавода. Ён прыўнёс у горад на час згубленую культуру. Як успамінаюць яго вучаніцы, ён любіў паўтараць: «Ты ж ружа, ты павінна цвісці ў руках мужчыны. Ён павінен весці, а ты — падпарадкоўвацца». Такія фразы супярэчылі савецкім агульнажыццёвым устаноўкам, але менавіта дзякуючы асаблівай атмасферы на занятках ці яго марыла трапіць ледзь не палова мінскай моладзі.

Як успамінае мінчанка Таццяна, у 70-я ў многіх школах быў абавязковы ўрок танцаў. А сярод дарослых нават праводзіліся негалосныя чэмпіянаты на адкрытых пляцоўках у парках і ў Доме афіцэраў. Таццяна расказвае і пра тое, як святы адзначалі цэлым дваром. З трох суседскіх дамоў выносілі мэблю, і кожны функцыянаваў па сваім прызначэнні. У адным стаялі сталы, у другім гулялі ў прэферанс, а ў трэцім, вядома, танцавалі. Так было аж да канца 70-х, пакуль домікі каля піўзавода пры пракладванні новай трамвайнай лініі не знеслі...

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*



Танцавальная пляцоўка ў 1950-я.

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
28.12.2017 г.
Лихачевский В. В.

# Краткая информация
# ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ первого выпуска
# Общества с ограниченной ответственностью «Финпрофит»

**1. Полное и сокращенное наименование Эмитента (на белорусском и русском языках):**

на белорусском языке:

полное: Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Фінпрофіт»;

сокращенное: ТАА «Фінпрофіт»;

на русском языке:

полное: Общество с ограниченной ответственностью «Финпрофит» (далее по тексту – Эмитент);

сокращенное: ООО «Финпрофит».

**2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, электронный адрес.**

Адрес местонахождения: Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. Некрасова, дом 7, комната 205.

Тел./факс +375 17 292-52-99, электронный адрес: info@finprofit.by, интернет-сайт – www.finprofit.by.

**3. Основной вид деятельности.**

Финансовый лизинг.

**4. Порядок оплаты Облигаций, номер расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие от размещения Облигаций, наименование обслуживающего банка.**

Денежные средства в долларах США за приобретаемые Облигации, поступающие по договорам купли-продажи Облигаций настоящего выпуска будут зачисляться в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на текущий (расчетный) счет Эмитента в долларах США. Датой осуществления оплаты Облигаций настоящего выпуска считается день поступления денежных средств на расчетный счет Эмитента.

Средства за приобретаемые Облигации перечисляются в течение 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договоров купли-продажи, если иное не было предусмотрено договором с конкретным инвестором.

Номера расчетных банковских счетов, на которые будут зачисляться средства за приобретаемые Облигации:

р/с BY51SLAN30112583450430100000 (доллары США) в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), р/с BY98SLAN30112583400350000000 (белорусские рубли) в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), BIC SLANBY22

УНП Эмитента – 191280674.

**5. Наименование депозитария, обслуживающего Эмитента.**

Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», код – 005. Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Депозитарий) зарегистрирован в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.10.1995 г., регистрационный номер 100325912.

Место нахождения Депозитария: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр. Дзержинского, 18.

Лицензия Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089 Министерства финансов Республики Беларусь (срок действия лицензии – бессрочно).

**6. Размер уставного фонда Эмитента. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.**

Уставный фонд Эмитента составляет 66 500 (шестьдесят шесть тысяч пятьсот) белорусских рублей.

Действующая редакция Устава Эмитента утверждена решением Общего собрания Участников ООО «Финпрофит» (протокол № 02 от 07.03.2017 г.) и зарегистрирована Минским городским исполнительным комитетом 10.03.2017 г., регистрационный номер 191280674.

**7. Дата принятия решения о выпуске Облигаций и наименование органа, принявшего это решение.**

Решение о выпуске Облигаций принято внеочередным Общим собранием участников Эмитента 30 августа 2017 года (протокол № 30/08 от 30.08.2017 г.).

**8. Форма Облигаций, объем выпуска и количество Облигаций, номинальная стоимость Облигации.**

Облигации первого выпуска – бездокументарные, именные, конвертируемые, процентные (далее – Облигации).

Объем выпуска Облигаций составляет 250 000 (двести пятьдесят тысяч) долларов США.

Количество Облигаций – 250 (двести пятьдесят) штук.

Номинальная стоимость 1 (одной) Облигации составляет 1 000 (одна тысяча) долларов США.

**9. Цель эмиссии Облигаций и направления использования средств, полученных от размещения Облигаций.**

Эмиссия Облигаций осуществляется с целью привлечения денежных средств физических и (или) юридических лиц (включая банки), индивидуальных предпринимателей, резидентов и нерезидентов Республики Беларусь для пополнения оборотных средств Эмитента, а также для увеличения основных фондов Эмитента, финансирования текущей хозяйственной и инвестиционной деятельности Эмитента.

Эмитент будет использовать средства, полученные от размещения Облигаций в соответствии с целями эмиссии.

**10. Способ обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.**

Исполнение обязательств по Облигациям первого выпуска Эмитента в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» обеспечивается залогом недвижимого имущества, принадлежащего Эмитенту на праве собственности на общую сумму 330 042,44 доллара США (триста тридцать тысяч сорок два доллара США сорок четыре цента) согласно независимой оценке указанного имущества индивидуальным предпринимателем Тихоновичем Дмитрием Владимировичем (заключение об оценке № 35-02/2017 от 17.11.2017 года). Свидетельство об аттестации оценщика № 30412, выданное на основании приказа Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 декабря 2008 г. № 392. Срок действия продлен до 01 января 2018 г. приказом Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 24 декабря 2014 г. № 341.

Состав и стоимость имущества, выступающего в качестве предмета залога:

| Наименование предмета залога | Идентификационный (инвентарный) номер | Стоимость для целей залога без НДС, долларов США |
|---|---|---|
| Капитальное строение, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Луговослободской с/с, Юго-Восточная окраина Минского района (наименование: здание коровника на 200 голов, назначение: здание специализированное животноводства), общей площадью 1675,4 кв. м | 600/С-117162 | 330 042,44 |

Вышеуказанное имущество ранее нигде не заложено, свободно от долгов, не подлежит удержанию, не обременено правами третьих лиц. Исполнение обязательств по Облигациям настоящего выпуска Эмитентом обеспечивается в течение всего срока обращения Облигаций, а также в течение трех месяцев после окончания срока обращения Облигаций, за исключением случаев исполнения Эмитентом обязательств по Облигациям в полном объеме до истечения указанного трехмесячного срока.

В случае утраты (гибели), повреждения предмета залога либо иного прекращения права собственности на него по основаниям, установленным законодательством, Эмитент осуществляет полную замену обеспечения исполнения своих обязательств по Облигациям либо в части утраченного, поврежденного, выбывшего по иным основаниям объекта залога и (или) принимает решение о досрочном погашении Облигаций (части Облигаций) данного выпуска.

Замена обеспечения исполнения своих обязательств по Облигациям осуществляется Эмитентом в течение двух месяцев с момента возникновения основания, влекущего необходимость замены обеспечения путем внесения соответствующих изменений в Решение о выпуске, изменений и (или) дополнений в Проспект эмиссии, а также регистрации изменений и (или) дополнений в Проспект эмиссии Облигаций и Решение о выпуске Регистрирующим органом. Не позднее 5 рабочих дней с даты регистрации соответствующих изменений в части замены обеспечения исполнения своих обязательств по Облигациям Эмитент размещает данную информацию на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, публикует в газете «Звязда» и (или) размещает на официальном интернет-сайте Эмитента, указанном в п. 2, а также на официальном сайте открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа (далее – Организатор торговли ценными бумагами) в глобальной сети Интернет.

Эмитент вправе по собственной инициативе принять решение о замене обеспечения исполнения обязательств по Облигациям в случае принятия соответствующего решения Эмитентом.

Эмитент уведомляет владельцев Облигаций о замене обеспечения в течение 10 (десяти) дней с момента принятия такого решения Эмитентом. В этом случае замена обеспечения производится с письменного согласия владельца (-ев) Облигаций.

В течение 60 (шестидесяти) дней с момента получения уведомления Эмитента о замене обеспечения владелец (владельцы) Облигаций сообщают Эмитенту письменно о своем согласии или несогласии.

При несогласии владельца (-ев) Облигаций с заменой обеспечения исполнения обязательств по Облигациям, владелец (владельцы) Облигаций вправе продать Облигации Эмитенту, направив одновременно с несогласием заявление о продаже Облигаций. Эмитент в случае получения в установленный срок заявления о продаже обязан в течение 60 (шестидесяти) дней после получения соответствующего заявления приобрести Облигации в порядке, определенном п. 19 настоящего документа.

Заявление подается по адресу местонахождения Эмитента с приложением копии выписки о состоянии счета «депо» владельца Облигаций с указанием количества Облигаций, принадлежащих владельцу.

Выкуп Облигаций производится Эмитентом по текущей стоимости на основании договора-купли продажи, заключенного между владельцем Облигаций и Эмитентом.

Эмитент имеет право осуществлять дальнейшую реализацию выкупленных Облигаций либо их досрочное погашение.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется в порядке, определенном в п. 17 настоящего документа.

**11. Способ и срок размещения Облигаций.**

Датой начала размещения (открытая продажа) Облигаций является 15 декабря 2017 года.

Датой окончания размещения (открытая продажа) Облигаций является 31 мая 2019 года.

**12. Порядок и условия размещения Облигаций. Место и время проведения размещения Облигаций.**

Размещение путем открытой продажи на организованном и на неорганизованном рынках Облигаций осуществляется Эмитентом после регистрации проспекта эмиссии Облигаций, заверения краткой информации об эмиссии Облигаций Регистрирующим органом и ее раскрытие путем размещения на Едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг, а также опубликования в газете «Звязда» и (или) размещения на официальном сайте Эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет, а в случае проведения открытой продажи Облигаций на организованном рынке – также и на официальном сайте организатора торговли в глобальной компьютерной сети Интернет.

Размещение (открытая продажа) Облигаций на организованном рынке осуществляется в торговой системе Организатора торговли ценными бумагами в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами Организатора торговли ценными бумагами.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь услуги по размещению (открытой продаже) Облигаций на организованном рынке Эмитенту оказывает профессиональный участник рынка ценных бумаг – открытого акционерного общества «Паритетбанк», расположенного по адресу: Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а, телефон/факс +375 (17) 288 63 32, электронный адрес (e-mail) -info@paritetbank.by, зарегистрированного Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 2014 года, регистрационный номер 5. Номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам 02200/5200-12-1154, срок действия лицензии – бессрочно.

Размещение (открытая продажа) Облигаций на неорганизованном рынке осуществляется Эмитентом, ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9.00 по 12.30 и с 13.30 по 16.00 по адресу: Республика Беларусь, 220040, г. Минск, улица Некрасова, дом 7, к. 205. Размещение (открытая продажа) Облигаций инвестору на неорганизованном рынке осуществляется путем заключения договора купли-продажи с Эмитентом на приобретение Облигаций в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь и законодательством Республики Беларусь по ценным бумагам.

Владельцами Облигаций могут быть физические и (или) юридические лица (включая банки), индивидуальные предприниматели, резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

В период размещения Облигации продаются первому их собственнику по цене, равной номинальной стоимости Облигации, увеличенной на сумму накопленного процентного дохода (по текущей стоимости Облигации). В дату начала открытой продажи, а также в даты выплаты процентного дохода текущая стоимость Облигации равна номинальной стоимости Облигации.

Текущая стоимость Облигации рассчитывается на дату совершения операции по следующей формуле:

$С = Нп + Дн$, где

С – текущая стоимость Облигации;

Нп – номинальная стоимость Облигации;

Дн – накопленный процентный доход.

Порядок расчета накопленного процентного дохода аналогичен порядку расчета процентного дохода, приведенному в п. 15 настоящего документа.

В случае расчета величины накопленного дохода при определении текущей стоимости Облигаций период начисления дохода определяется с даты начала размещения по дату расчета текущей стоимости или с даты выплаты последнего процентного дохода по дату расчета текущей стоимости Облигаций.

**13. Срок обращения Облигаций.**

Срок обращения Облигаций устанавливается с 15 декабря 2017 года по 31 декабря 2020 года включительно и составляет 1112 календарных дней.

Дата начала размещения и дата начала погашения Облигаций считаются одним днем.

**14. Дата начала погашения Облигаций** – 31 декабря 2020 года.

**15. Размер и порядок определения размера процентного дохода по Облигациям, условия его выплаты. Период начисления процентного дохода по Облигациям.**

По Облигациям установлен постоянный процентный доход в размере 8,5 (восемь целых и пять десятых) процента годовых. Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинальную стоимость Облигации за период начисления процентного дохода.

Величина процентного дохода по Облигации рассчитывается по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пп}{100} \times \left(\frac{T_{365}}{365} + \frac{T_{366}}{366}\right),$$

где:

Д – процентный доход;

Нп – номинальная стоимость Облигации;

Пп – величина ставки процентного дохода за процентный период, установленная Эмитентом (процентов годовых);

$T_{(365)}$ – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящихся на календарный год, состоящий из 365 дней;

$T_{(366)}$ – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящихся на календарный год, состоящий из 366 дней.

Расчет суммы процентного дохода по Облигации производится по каждой Облигации из расчета 365 (366) дней в году и фактического количества дней соответствующего периода начисления процентного дохода. Выплата части процентного дохода в течение периода начисления процентного дохода не производится.

Выплата процентного дохода владельцам Облигаций производится:

периодически в соответствии с Графиком начисления и выплаты процентного дохода (указан в п. 16 настоящего документа) в течение срока обращения Облигаций;

на основании реестра владельцев Облигаций, формируемого Депозитарием Эмитента (даты формирования реестра для целей выплаты дохода указаны в п. 16 настоящего документа);

путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода в белорусских рублях по курсу Национального банка на дату выплаты процентного дохода на счета владельцев Облигаций.

В случае отсутствия в реестре владельцев Облигаций данных о счетах владельцев Облигаций, а также в случае если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается после непосредственного письменного обращения владельца Облигации. Проценты за указанные дни не начисляются и не выплачиваются.

Период начисления дохода по Облигациям – с 16 декабря 2017 г. по 31 декабря 2020 г. (с даты, следующей за датой начала размещения Облигаций, по дату начала погашения Облигаций включительно).

